Хойніцкі раённы аддзел адукацыі
Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа № 3 г. Хойнікі"

Урок падагульнення і сістэматызацыі вывучанага
па раздзеле "Дзеяслоў" у 6 "А" класе

Настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Васькевіч Вольга Арсенцьеўна

2013

**Тэма.** Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле "Дзеяслоў"

**Мэта ўрока:** паўтарыць матэрыял па тэме; падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў па правапісе дзеясловаў;
удасканальваць практычныя ўменні і навыкі (арфаграфічныя, арфаэпічныя, пунктуацыйныя);
спрыяць фарміраванню пачуцця гонару і любові да роднага краю, павагі да беларускага слова.

**Тып урока:** урок абагульнення і сістэматызацыі ведаў.

**Тэхналогія:** развіццё крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо.

**Абсталяванне:** карткі, мультымедыйны праектар.

## Ход урока

**І. Арганізацыйны момант.**

**Настаўнік.** Вітаю вас, сябры, на нашай сустрэчы. Сёння наш урок будзе незвычайным. Павярніцеся і прывітайце гасцей усмешкай, а цяпер – адзін аднаго. Вы здольныя, разумныя, і, вядома ж, у вас усё атрымаецца. Працаваць мы будзем пад дэвізам: *"Зробім школьныя заданні без памылак, са стараннем".*

**ІІ. Паведамленне тэмы. Пастаноўка задач урока**

1. **Матывацыя тэмы.**

**Настаўнік.** Для таго, каб захаваць працаздольнасць, нам патрэбны добры настрой. Па якіх прыметах можна вызначыць, што чалавек знаходзіцца ў добрым настроі? (Жартуе, усміхаецца, спявае).

- Словы якой часціны мовы вы назвалі?
- Ці знаёмае для вас гэтае слова?
- Што неабходна засвоіць на працягу ўрока? (на слайдзе змешчаны ключавыя словы: паўтарыць, падагульніць, сістэматызаваць, удасканальваць, спрыяць).

(*Слайд з мэтамі ўрока дэманструецца пасля таго, як шасцікласнікі вызначаць іх самастойна*).

**ІІІ. Актуалізацыя ведаў.**

Настаўнік чытае эпіграф да ўрока (запіс на слайдзе).

*"Ёсць у кожнага свой мілы сэрцу куток, які з бегам гадоў не толькі (не) ц..мее ў пам…ці, а станові(ц,ца) як бы яснейшы, даражэйшы…*

*Сярод іншых дарагіх, хвалюючых успамінаў – ён самы дарагі, самы шчымлівы.*

*Куток гэты – тая хата, дзе мы вучыліс(сь,ся) хадзіць, дзе чулі ц..плыню матчыных рук і матчынага сэрца, куток нашага маленства".*

*І. Мележ*

**Настаўнік.** Якім пачуццём прасякнуты гэтыя радкі?

*(Адказы вучняў).*

**Настаўнік.** А як вы адносіцеся да кутка свайго дзяцінства?

*(Адказы вучняў).*

**Настаўнік.** Я бачу, што вашыя пачуцці сугучныя з пачуццямі аўтара, таму мы можам выкарыстаць гэтыя радкі ў якасці эпіграфа да ўрока. Гэта значыць, што лексічнай тэмай нашага ўрока будзе тэма "Адвечная прыгажосць нашай зямлі" (на матэрыяле твораў І.Мележа).

**Настаўнік.** Зараз папрацуем над тэкстам эпіграфа.

1) Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс:
   цьмее – ?
   дзьме – ?
   памяць – ?
   цеплыня – ?
2) Раскрыйце дужкі, запішыце словы і растлумачце свой выбар.
3) Што трэба ведаць, каб не памыліцца ў напісанні гэтых слоў?

**IV. Паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага.**

*1.Работа з тэкстам.*

Спісаць тэкст, уставіць прапушчаныя літары і знакі прыпынку, дапісаць канчаткі дзеясловаў, абазначыць іх.

*Над Мінскам шум… халодныя восен…скія в..тры. Неба то засіне… між разарваных ветрам воблакаў то зноў надоўга знікн… за шчыльнай заслонай ні..кіх ця…кіх хмар. Збітае дажджамі і в…трамі жоўтае ліс…це ліп выс..ціла… мокры з ц…мяным бляскам асфальт праспектаў, плошчаў, сквераў.*

1. У форме якога часу ўжыты дзеясловы?
2. Ад чаго залежыць правільнае напісанне канчаткаў дзеяловаў?
3. Якія словы з гэтага тэксту вы ўключылі б у слоўнікавы дыктант? Чаму? Давайце падкрэслім гэтыя словы.

(*Восеньскі (літара ь у сярэдзіне слова), нізкі, цяжкі(звонкія і глухія зычныя), дождж(напісанне слоў з дж), вецер, вятры (правапіс е, ё – я),*

*лісце, усцілае (суседняя мяккасць), цьмяны (літара ь у сярэдзіне слова), асфальт (слоўнікавае слова), плошча, шчыльны (напісанне слоў з шч)).*
*2. Выбарачны дыктант.*
**І варыянт:** выпісаць дзеясловы, якія ў 2-ой асобе множнага ліку цяперашняга часу маюць канчаткі *–яце.* Дапоўніць сваімі прыкладамі.
**ІІ варыянт:** выпісаць дзеясловы, якія ў 2-ой асобе множнага ліку цяперашняга часу маюць канчаткі *–еце.* Дапоўніць сваімі прыкладамі.

*Шчодра цвіў гэтай вясною сад. Спачатку вішні і грушы, потым – яблыні. Была пара, калі ўсе дрэвы стаялі, як белыя, ружаватыя воблакі. Млелі пяшчотныя, цудоўныя пахі. Пахі гэтыя поўнілі сад і вуліцу. Уся зямля здавалася белай, была поўная квецені, пахаў.*

**І варыянт**
*Цвіў – цвіцяце*
*Здавалася – здаяцеся*
*Несці – несяце*
*Везці – везяце*
*Ідзём –ідзяце*
**ІІ варыянт**
*Млелі – млееце*
*Была – будзеце.*
*Чытаеце, гуляеце*

Што трэба ведаць, каб не памыліцца ў напісанні канчаткаў дзеясловаў 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга часу?
*3. Пазнавальнае заданне "Карэктар".* Выпраўце памылкі там, дзе яны дапушчаны. Успомніце правілы, на якія дапушчаны памылкі. Згрупуйце словы паводле правілаў.

*У лагодным сонечным светле гарелі сумным атвечным полымем ліпы і бярозы каля хат, древы ў не далёкім лесе. Як сівізна ад былога, пережытага, белела усюды павутіна. Яна вісела у паветры, апчеплівала павялы і пасохлы бульбовнік, калы і жэрткі вакол агародаў, пажовклыя кусты. Усё агартаў спакойны, стары, як сьвет, смутак развітаня с цяплом, з летам, набліженя слаты, халадоў.*

1. Святле, бялела.
2. Гарэлі, набліжэння, дрэвы.
3. Бялела ўсюды, вісела ў паветры, пажоўклыя, бульбоўнік.
4. Павуціна, цень, цёплы.

5. Набліжэння, развітання.
6. Свет, усмешка, цвік.
7. Абчэплівала.

-У форме якога часу ўжытыя дзеясловы ў гэтым тэксце?

Запішыце дзеясловы ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку.

*4.Фізкультхвілінка.*

Той, хто лічыць сябе патрыётам,
Падыміся!
Той, хто ўдзячны зямлі Беларусі,
Пакланіся!
Хто лічыць сябе шчаслівым,
Усміхніся!
Хто да добрых ведаў імкнецца,
Пацягніся!
Хто сябру жадае дабра,
Прывітайся!
І хутчэй да кніг за стол
Вяртайся!

*5.Заданне "Рэдактар".*

Выконваецца на картках.

Замяніце неазначальную форму дзеяслова формай прошлага часу.

1) Перад раніцай (*прашумець)* навальніца.

2) На світанні яна (*сціхнуць)*, дождж (*сысці)* на захад, да Прыпяці, а за ім хутка (*сплыць)* і хмары.

3) Над вымытымі вадой палямі (*засінець)* чыстае неба і (*зазіхацець)* яркае жнівеньскае сонца.

4) (*Быць)* ў самым разгары жніво, жыта ўжо (*зжаць)*, а ячмень і пшаніца яшчэ амаль усюды (*стаяць)* некранутыя, (*чакаць)* вострых сярпоў.

5) Пад палючымі праменнямі сонца хутка (*выспяваць)* загоны аўса.

**Заданні:**

1-ая група. Вызначце час, род, лік, спражэнне дзеясловаў у другім сказе. Пракаменціруйце напісанне.

2-ая. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў другім сказе. Утварыце формы ўмоўнага ладу, растлумачце правапіс дзеясловаў.

3-ая група. Ад дзеясловаў у 4 сказе ўтварыце форму загаднага ладу. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе. Знайдзіце слова з падоўжаным гукам [ ж ].

*6.Пазнавальнае заданне "Падумаем, успомнім, растлумачым"*

а) Як трэба пісаць: *стрыжом, стрыжэм* ці *стрыгом?*

*Сячом, сячэм* ці *сяком?*

*Пячом, пячэм* ці *пяком?*

*Тчом, тчэм* ці *тком?*

б) Чаму ў дзеясловах *веяць, веяў, веяла; сеяць, сеяў, сеяла* пішацца ***я***, а ў дзеясловах *веем,веецe, сеем, сеецe – **е***?

*7. Арфаграфічная хвілінка*

- Прадоўжым выпрацоўку арфаграфічных уменняў. Узнавіце ў памяці алгарытмы правапісу дзеясловаў.

а) Устаўце замест кропак, дзе патрэбна, мяккі знак.

Ляж…це, змаж...це, кін…це, стан..це, сядз..це, удар..це.

б) Устаўце з ці с

..рабіць, ..жаць, ра..сыпаць, ра..біць, ра..рэзаць, ..шыць.

в) На месцы пропускаў устаўце суфіксы –ва-, -іва- (-ыва-), -оўва-(-ёўва).

Адыгр..лі, супакой..е, зачар..е, прывабл..е, высвіст..юць, перашэпт..юцца.

г) Запішыце *не (ня)* з дзеясловамі разам ці асобна.

(Не)пакоіць, (не)хацеў, (не)здаровіцца, (не)чытаў, (не)навідзець, (не)дабачыць.

*9.Выкананне тэста.*

**V. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

**VI. Дамашняе заданне.**

Напісаць міні-сачыненне "Мілы сэрцу куток". Выкарыстаць у ім наступныя ключавыя словы, папярэдне выправіўшы ў іх памылкі: *нарадіцца, атчуваць, стараца, незабыць, шанавать, захапляца.*

**VII. Заключнае слова настаўніка.**

- Я вельмі ўдзячная вам, дзеці, за плённую працу на ўроку, а таксама ўсім прысутным, хто далучыўся да нашай работы.

У акіяне слова – ані межы, ні донца.
Ёсць там адна аснова: праца і праца бясконца.

Няхай гэтыя словы стануць дэвізам у вашай рабоце!